7. Правила о порядке рассмотрения государственной росписи, а равно о производстве из казны расходов, росписью не предусмотренных // Законодательные акты переходного времени 1904 – 1908 гг. – Спб.: Право, 1909. – С. 294 - 299
8. Учреждение Государственной Думы 20 февраля 1906 г. // Законодательные акты переходного времени. - С. 941 – 957.
9. Учреждение Государственного Совета (24 апреля 1906 г.) // Конституция Российской империи. – Спб.: Экон. Тип., 1907. – С. 144 – 171.
10. Чичерин Б.Н. Восточный вопрос с русской точки зрения // Записки князя Трубецкого. – Спб.: Общественная польза, 1907. – С. 120 – 153.
11. Чичерин Б.Н. Курс государственной науки. – В 3-х т. – М.: Кушнерева, 1894 - 1898.
12. Чичерин Б.Н. Несколько современных вопросов. – М.: Грачева, 1862. – 265 с.
13. Чичерин Б.Н. О народном представительстве. – М.: Грачева, 1866. – 552 с.
14. Чичерин Б.Н. Священный союз и Австрийская политика // Исторический сборник вольной русской типографии в Лондоне А.И.Герцена и Н.П.Огарева. – Кн. 1. – 1859. – М.: Наука, 1971. – С. 145 – 164.
15. Чичерин Б.Н. Современные задачи русской жизни // Голоса из России. – 1856. – Вып. 1. – Кн. 4. – С. 51 – 123.
16. Юртаева Е.А. Государственный совет России (1906 – 1917 гг.). – М.: Эдиториал УРСС, 2001. – 200 с.

***Olena Zinchenko***

**THEORY AND PRACTISE OF THE LIBERALIZATION OF RUSSIAN EMPIRE [THE SECOND HALF OF XIX – BEGINNING OF XX CENTURIES]**

*In article the major features of theoretical and practical liberalization of Russian empire during the second half of XIX - beginning of XX centuries are installed.*

*Keywords: B.N.Tchitcherin, liberalization, constitutional monarchy, the State Duma, the State council.*

Надійшла до редакції 14.03.2008 р.

УДК 947.6:323.1(470)(=161.3)"18-19":930(476.2)"20"

***Аляксандр Грахоцкі***

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ РАСІЙСКАЙ УРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*У артыкуле разглядаецца стан сучаснай беларускай гістарыяграфіі расійскай урадавай палітыкі на Беларусі ў друг. пал. XIX – пач. XX ст., вызначаюцца плыні ў гістарыяграфіі праблемы, асноўныя накірункі даследаванняў.*

*Ключавыя словы: сучасная беларуская гістарыяграфія, расійская ўрадавая палітыка, Беларусь, Расійская імперыя.*

Пасля абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь распачалася распрацоўка нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі. На пачатку 1993 г. у першым нумары "Беларускага гістарычнага часопіса" выйшаў артыкул выбітнага беларускага гісторыка М. Біча, у якім выкладалася нацыянальная канцэпцыя гістарычнага мінулага краіны [1]. У артыкуле даследчык вызначаў падыходы нацыянальнай гістарыяграфіі і да праблем становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. М. Біч пісаў, што на працягу 1830-1865 гг. расійскімі ўладамі на Беларусі была ўсталяваная сістэма выключных законаў, накіраваная на татальную русіфікацыю краю. У комплексе гэтыя законы вызначалі каланіяльнае становішча беларускіх земель. Да такіх мерапрыемстваў царызму гісторык адносіў: буйнамаштабнае, звязанае з масавымі рэпрэсіямі, насаджэнне рускага землеўладання і чынавенства, "разбор" шляхты, ліквідацыю уніяцкай царквы, адмену дзейнасці Статута ВКЛ, закрыццё Віленскага універсітэта і Горы-горацкага земляробчага інстытута, суцэльную русіфікацыю сярэдняй і пачатковай школы, пазбаўленне права на выбарнае земства і выбарныя міравыя суды, на адрыццё ВНУ, забарону выбарчага дваранскага



*© Грахоцкі А.П., 2008*

самакіравання, устанаўленне шматлікіх абмежаванняў для беларусаў-каталікоў, мясцовых палякаў і яўрэяў. Даследчык прыйшоў да высновы, што ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі негатыўна адбілася на сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі [1, с. 20-21]. На падставе нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, ў 1994 г. выйшаў першы ў суверэннай Беларусі абагульняючы выклад айчыннай гісторыі, падрыхтаваны Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, двухтомнік "Нарысы гісторыі Беларусі" [2].

У першай палове 90-х гг. XX ст. у беларускай гістарыяграфіі выразна прасочваўся рост інтарэсу гісторыкаў да вывучэння праблем расійскай урадавай палітыкі на Беларусі ў другой пал. XIX – пач. XX ст. Шэраг артыкулаў беларускіх гісторыкаў С. Токця, Д. Карава, Н. Гулак быў прысвечаны палітыцы М.М. Мураўёва на Беларусі ў 1863-1865 гг. [3]. Пытанні стаўлення царызму да беларускай мовы закраналіся ў навукова-публіцыстычных артыкулах С. Сяльвестравай-Куль [4]. Пытанні канфесійнай палітыкі расійскага ўрада на Беларусі ў гэты час даследавалі В.В. Грыгор'ева, П.У. Церашковіч [5]. Праблемы лібералізацыі расійскага ўрадавага курса на Беларусі падчас генерал-губернатарства П. Святаполк-Мірскага (1902 - 1904 г.) даследаваў В.П. Пічукоў [6].

Другая палова 90-х гг. XX ст. унесла нечаканыя змены ў развіццё сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Зноў, як і ў папярэднія этапы развіцця гістарычнай навукі Беларусі, беларуская нацыянальная гістарыяграфія і дзяржаўная палітыка пайшлі рознымі шляхамі. У 1998 г., як своеасаблівая альтэрнатыва "нацыяналістычным" "Нарысам гісторыі Беларусі", выходзіць новае двухтомнае выданне "Гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй прафесараў Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля [7]. Аўтары выдання адзначылі станоўчую ролю факта далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў гісторыі Беларусі. Адпаведна, у кнізе ўвогуле не ўзгадвалася аб русіфікацыйнай палітыцы расійскай адміністрацыі на Беларусі.

Знакавым для беларускай гістарыяграфіі быў 2003 г., калі ў свет выйшлі дзве каардынальна адрозныя па сваіх ацэнках і падыходах аўтарскія сінтэтычныя працы па гісторыі Беларусі. Гэта былі "Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002 г." З. Шыбекі і выклад "Истории Беларуси" Я. Трашчанка [8, 9].

У кнізе З. Шыбекі пытанні расійскай урадавай палітыкі на Беларусі ў другой пал. XIX – пач. XX ст. атрымалі дастаткова шырокае адлюстраванне. Асноўным стрыжнем царскай палітыкі ў Беларусі пасля паўстання 1863 г., па словах гісторыка, стала русіфікацыя. Даследчык апісаў русіфікатарскія мэты адміністрацыйна-кадравай, канфесійнай, каланізацыйнай і адукацыйнай палітыкі царызму. З. Шыбека прыйшоў да высновы, што русіфікацыйная палітыка мела для беларусаў трагічныя вынікі: яна перапыніла працэс фарміравання беларускай нацыі, далучэнне беларускай масы да рускай культуры ва ўмовах адсутнасці ўласнай дзяржавы і адметнай рэлігіі давала "эфект дэнацыяналізацыі". Аўтар звярнуўся і да разгляду пытанняў эканамічнай урадавай палітыкі на Беларусі. З. Шыбека адзначыў, што расійскія ўлады не рабілі інвестыцыяў у эканоміку Беларусі, а толькі выкарыстоўвалі яе танныя прыродныя і грашовыя рэсурсы.

Аўтарская канцэпцыя гісторыі Беларусі Я.І Трашчанка здолела ўвабраць у сябе несумяшчальнае: марксісцка-ленінская ідэалогія дзіўным чынам спалучаецца з кансерватыўнай шавіністычнай ідэалогіяй расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі. Так, напрыклад, аўтар прытрымліваецца марксісцкай перыядызацыі гісторыі, нават раздзелы яго кнігі адзін у адзін супадаюць з раздзеламі "Истории БССР" 1954 і 1961 гадоў выдання [10]. Аднак, у той жа час, характарызуючы паўстанне 1863-1864 гг., Я. Трашчанок прыйшоў да высноў, якія фактычна апраўяргаюць сутнасць (крэдо) марксісцкай гістарыяграфіі: "... Пора отказаться от чёрно-белой оценки исторических событий, в которых всё, что в XIX в. исходит от власти, однозначно трактовалось как реакционное, и всё направленное против власти – как революционное, прогрессивное… В подобной интерпритации нередко утрачивалась грань между революционными протестами и обыкновенной уголовщиной, просто своекорыстными противоправными действиями отдельных лиц и груп, лишь прикрывавшихся революционными лозунгами. Об этом особенно стоит помыслить, когда речь идёт о столь неоднозначных событиях, как польское восстание 1863 г." [9, с. 223]. Высновы аўтара аб "уголовщине", "своекорыстных противоправных действиях" паўстанцаў 1863 г. ставяць працу Я.І. Трашчанка ў адзіны шэраг з даследаваннямі В. Ратча, А.І. Мілавідава, П.Д. Бранцава і іншых дарэвалюцыйных гісторыкаў [11]. Аднак пры інтэрпрытацыі падзей далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, высновы даследчыка супадаюць ужо з абедзвюма гістарычнымі канцэпцыямі (і з савецкай і з расійскай дарэвалюцыйнай). Я.І. Трашчанок адзначае: "И мы должны знать – только в братском единстве "со всей Русью" белорусский народ видел залог своего счастливого будущего, за это боролся и страдал, это воспевал в песнях, поэтизировал в легендах" [9, с. 18]. Аўтар адзначаў, што асновай непрымірымых супярэчнасцяў паміж "польскім" дваранствам і беларускім сялянствам было тое, што дваранства ў сваёй масе знаходзілася ў апазіцыі да царскіх улад, а мясцовае сялянства гэтую ўладу падтрымлівала. На думку гісторыка, не расійскія ўлады, а польскія паны былі каланізатарамі для "беларускага мужыка" [9, с. 234].

Паступова, на працягу свайго развіцця, сучасная беларуская гістарыяграфія запаўняе асобныя “белыя плямы” ў пытаннях расійская ўрадавай палітыкі на Беларусі. У 1997 г. была абароненая кандыдацкая дысертацыя С.М. Токця на тэму “Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30 – 60-х гг. XIX ст.”, у якой разглядаліся аспекты адміністрацыйна-кадравай палітыкі самадзяржаўя [12]. У сваёй рабоце гісторык прасочвае эвалюцыю мясцовага дзяржаўнага кіравання Беларусі на працягу адзначанага перыяду ад саслоўна-бюракратычнай да паліцэйска-бюракратычнай мадэлі. Лагічным працягам вывучэння пытанняў адміністрацыйна-кадравай палітыкі царызму на Беларусі сталася даследаванне Н.А. Роцькі, у якім гісторык разглядаў змены ў становішчы чыноўніцтва Беларусі ў 60 - 90-ыя гг. XIX ст. [13].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўздымалася і пытанне аб каланіяльным становішчы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі [14]. А. Кіштымаў у сваім артыкуле не знаходзіць пераканаўчых доказаў каланіяльнага становішча Беларусі ў складзе імперыі: палітыка насаджэння расійскага землеўладання поспеху не мела; тэзіс аб кланіяльным характары эканомікі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. не знаходзіць гістарычнага падцвярджэння; нельга прызнаць як каланізатарскую меру і “разбор шляхты”, бо класічныя каланізатары імкнуліся захаваць у калоніях мясцовую “туземную” ўладу, каб з яе дапамогай экплуатаваць пакоранае насельніцтва; мэтам уніфікацыі, збліжэння, зліцця ў адзінае цэлае, а не дзяленню на метраполію і калонію, служылі ўрадавыя мерапрыемствы па скасаванню уніі, русіфікацыі адміністрацыйнага кіравання і адукацыі.

Дастаткова шырокую распрацоўку у сучаснай беларускай гістарыяграфіі атрымалі пытанні адукацыйнай палітыкі расійскіх улад на Беларусі. У 1999 г. па праблеме адукацыйнай палітыкі царызму і педагагічнай думкі Беларусі ў 60-я гг. XIX ст. – 1917 г. была абароненая доктарская дысертацыя С.В.Снапкоўскай [15]. Зроблены даследчыцай аналіз напрамкаў і механізмаў рэалізацыі ўрадавай адукацыйнай палітыкі на Беларусі ў моўнай, канфесійнай, арганізацыйна-кадравай галінах паказвае, што ў выніку актыўнай русіфікацыі да канца XIX ст. агульнаадукацыйная сістэма была перабудавана ў адпаведнасці з палітычнымі і ідэалагічнымі інтарэсамі самадзяржаўя.

Сапраўдным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі сталася выданне калектыўнай працы “Канфесіі на Беларусі”, у якой аўтары прааналізавалі змены ў канфесійным становішчы Беларусі з канца XVIII ст. і да канца XX ст. [16]. Другая глава кнігі называецца “Русіфікацыя насельніцтва і канфесійная палітыка царызму на Беларусі (1861-1904 гг.)” [16, с. 58-110]. Яе аўтар В.В. Грыгор’ева (зараз Яноўская) разгледзела стаўленне духавенства розных хрысціянскіх канфесій да паўстання 1863 г., урадавую палітыку русіфікацыі насельніцтва Беларусі праз праваслаўную царкву, адносіны ўрада да каталіцтва, стараверства і пратэстантызму. У 2002 г. у свет выйшла манаграфія В.В. Яноўскай, у якой даследчыца падае грунтоўны разгляд урадавай палітыкі ў дачыненні да хрысціянскіх канфесій Беларусі [17].

“Польскае пытанне” ва ўрадавай палітыцы расійскага самадзяржаўя на Беларусі разглядаецца ў манаграфіі А.Ф. Смалянчука [18]. Стрыжневай высновай працы вядомага беларускага гісторыка з’яўляецца тэза аб тым, што польская грамадскасць беларускіх і літоўскіх земляў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст., якая сфарміравалася ў выніку ранейшых працэсаў паланізацыі і самапаланізацыі, не страціла сувязі з Айчынай і не ператварылася ў “польскіх каланізатараў”. А.Ф. Смалянчук сцвярджаў, што паланізаваныя колы насельніцтва Паўночна-Заходняга краю заставаліся “мясцовым элементам”, неад’емнай часткай этнакультурнага і грамадска-палітычнага краягляду гістарычнай Літвы. На думку даследчыка, вырашэнне расійскімі ўладамі “польскага пытання” набыло характар цывілізацыйнага канфлікту, ад вынікаў якога ў пэўнай ступені залежаў вектар развіцця Беларусі. А.Ф. Смалянчук адзначыў, што палітыка Расійскай дзяржавы на беларускіх і літоўскіх земляў эвалюцыянавала ад курса на дзяржаўную асіміляцыю мясцовага насельніцтва і ўніфікацыю Паўночна-Заходняга краю да спробаў поўнай палітычнай дэпаланізацыі і імкнення забяспечыць абсалютнае дамінаванне “велікарускага элемента” не толькі ў палітычным, але і ў нацыянальна-культурным жыцці. Асноўнай прычынай, па якой расійскія ўлады так і не здолелі канчаткова вырашыць “польскае пытанне”, даследчык называе недахоп у імперыі неабходнага цывілізацыйнага патэнцыялу.

Спецыфіка ўрадавай палітыкі ў дачыненні да дваранскага саслоўя Беларусі ў другой пал. XIX – пач. XX ст. разглядаецца ў манаграфія А.П. Жытко [19]. Новым для беларускай гістарыяграфіі сталася вывучэнне расійскай урадавай палітыкі ў сферы горадабудаўніцтва (З. Шыбека), чыгуначнага транспарту (С. Жыхараў), гандлю (В.А. Карніевіч) [20].

У 2000 г. распачалося выданне “Гісторыі Беларусі” ў шасці тамах. Гэтае выданне па праву прэтэндуе на найбольш комплексны, усеабдыбны агляд гісторыі Беларусі з адлюстраваннем навейшых падыходаў і ацэнак сучаснай беларускай гістарыяграфіі. 4-ты том “Беларусь у складзе Расійскай імперыі (к. XVIII – пач. XX ст.)” выйшаў у свет у 2005 г. [21]. Аднак, на нашу думку, расійская ўрадавая палітыка на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. не атрымала ў кнізе належнага разгляду. У выданні адсутнічае асобны агляд (хаця б пункт), у якім вызначаліся б прынцыповыя мэты, задачы расійскай палітыкі на Беларусі, шляхі іх вырашэння, асноўныя накірункі ва ўрадавай палітыцы. Гэтак,

значная ўвага ў кнізе надаецца разгляду канфесійнай палітыцы царызму (пад аўтарствам В.В. Яноўскай), аднак фактычна адсутнічае агляд урадавай палітыкі ў сферы адукацыі і асветы, амаль не закранаюцца пытанні саслоўнай, каланізацыйнай, адміністрацыйна-кадравай, этналінгвістычнай палітыкі расійскай адміністрацыі на Беларусі. Па сутнасці, навейшая і найбуйнейшая праца па гісторыі Беларусі не дае чытачу прамых адказаў на прынцыповыя пытанні: ці праводзіў расійскі ўрад на Беларусі палітыку планамернай і мэтанакіраванай русіфікацыі; калі такая палітыка мела месца, дык у якіх мэтах яна праводзілася – дэпаланізацыі, асіміляцыі ці інтэграцыі беларусаў у агульнарасійскую прастору; якім быў характар эканамічнай палітыкі расійскіх улад ў дачыненні да беларускіх губерняў, царызм праводзіў на Беларусі дыскрымінацыйны эканамічны курс ці ўрадавыя мерапрыемствы былі скіраваныя на інтэнсіўнае развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і гандлю Беларусі.

Сярод апошніх публікацый, прысвечаных праблемам расійскай урадавай палітыкі на Беларусі, вылучаюцца артыкулы А.Ю. Бендзіна [22, 23]. У абодвух артыкулах надаецца значная ўвага рагляду палітыкі М.М. Мураўёва на Беларусі. У сваіх работах аўтар адмаўляе самастойнае існаванне беларускага этнасу, зыходзіць з тэзы аб адзіным рускім народзе, які складаўся з трох галін: вялікарускай, маларускай і беларускай. Русіфікацыйная палітыка М. Мураўёва на Беларусі атрымала у рабоце аўтара найменне “мадэрнізацыі”, паводле якой “... русский интегральный национализм становился инструментом социокультурной и экономической эмансипации белорусского крестьянства” [22, с. 67]. Гэтак, А. Бендзін імкнецца прадставіць дзейнасць М.М. Мураўёва ў якасці каталізатара нацыянальнага абуджэння беларускага народа ў 60-е гг. XIX ст. Для гэтага гісторык выкарыстоўвае канцэпцыю М. Гроха па апісанню нацыянальных рухаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў XIX – пачатку XX ст. Аўтар прыйшоў да высновы, што абуджальнікамі і агітатарамі нацыянальных ідэй беларусаў стала не нацыянальная інтэлігенцыя, як у іншых рэгіёнах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а расійская адміністрацыя начале з М.М. Мураўёвым, яго паплечнікамі і пераемнікамі [22, с. 70; 23, с. 27]. Гэтак, сваім нібыта сінсацыйна-наватарскім падыходам да разгляду адзначанай праблемы, на нашу думку, А.Ю. Бендзін не прынёс у беларускую гістарыяграфію нічога новага. Усе высновы і ацэнкі аўтара цалкам супадаюць з вывадамі расійскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў кансерватыўна-манархічнай плыні (А.І. Мілавідава, П.Д. Бранцава, В.Ф. Ратча і інш.). Выкарыстанне ж у дадзеным выпадку канцэпцыі чэшскага гісторыка М. Гроха, на наш погляд, з’яўляецца зусім не ўдалай спробай аўтара прыстасаваць канцэпцыю вывучэння нацыянальных рухаў да асвятлення палітыкі расійскіх улад на Беларусі. Падобныя ацэнкі дзейнасці М.М. Мураўёва змяшчаёцца і ў артыкуле В. Гігіна [24]. Аўтар прама адзначае: “И, пожалуй сейчас пора заявить со всей определённостью, что Михаил Николаевич Муравьёв, граф Виленский, русский по происхождению, православный по вероисповеданию, консерватор по убеждениям, выдающийся администратор-управленец, являлся крупнейшим государственным деятелем Беларуси XIX века и по праву должен занимать почётное место в пантеоне героев нашего народа” [24, с.139].

Паказальным для сучаснай беларускай гістарыяграфіі стаўся выхад кнігі члена-карыспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі П.Ц. Петрыкава “Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е - начало 2000-х годов)” [25]. У даследаванні П.Ц. Петрыкаў падаў сваё бачанне праблем расійскай урадавай палітыкі на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Парадаксальным, на нашу думку, з’яўляецца той факт, што гісторык, які пазіцыянаваў сябе як прыхільнік маркісцка-ленінсай метадалогіі і савецкай гістарыяграфіі, ў сваёй працы выступае ў ролі зацятага абаронцы расійскага самадзяржаўя на Беларусі. Гэтак, мерапрыемствы царызму па насаджэнню на Беларусі рускага памешчыцкага землеўладання і чынавенства гісторык тлумачыць імкненнем улад выратаваць беларусаў ад польскага прыгнёту [25, с. 60]. Далей гісторык прама крытыкуе савецкую гістарыяграфію, якая “... видела плодотворное влияние на прогресс общества прежде всего только со стороны восстаний, тайных антиправительственных обществ, вообще – революционеров” [25, с. 60]. Менавіта гэта тэза савецкай гістарычнай навукі, на думку П.Петрыкава перашкаджала і перашкаджае гісторыкам адзначыць “… позитивную историческую роль царского правительства, русского народа и русской культуры в возрождении и развитии белорусского национального сознания и самосознания” [25, с. 61]. П.Ц. Петрыкаў адзначыў, што палітыка царызму была скіравана не супраць беларусаў і “беларускага народа ў цэлым”, а супраць агрэсіўнага польскага нацыянал-клерыкалізма ў беларускіх губернях. Паводле П. Петрыкава, расійская улада ўзяла на сябе ролю месіі, выратавальніцы “единокровного (древнерусского) белорусского народа”: “Россия распространила на белорусские губернии все свои достижения государственной, хозяйственной, религиозной и культурной жизни. Никаких ограничений для белорусов по национальному признаку на всей территории Российской империи не было. Белорусы получили возможность учиться на родном им русском языке... ” [25, с. 64].

Сентэнцыі П.Ц. Петрыкава прыводзяць да прынцыповай высновы нашага даследавання: у працах прыхільнікаў савецкай інтэрпрытацыі гістарычнага мінула Беларусі адбыўся істотны перагляд ацэнак расійскай урадавай палітыкі на Беларусі. Калі савецкая гістарыяграфіі ў цэлым адзначала адмоўны ўплыў расійскай урадавай палітыкі на станаўленне беларускай нацыі, развіццё беларускай нацыянальнай культуры і літаратурнай мавы, дык сучасныя "савецкія" гісторыкі (П.Ц. Петрыкаў, Я.І. Трашчанок, Я.К. Новік, Г.С.Марцуль) апраўдваюць расійскі ўрадавы курс. Менавіта палітыка расійскага самадзяржаўя, на іх думку, абумовіла выспяванне беларускай нацыі, развіццё беларускай мовы і культуры і, як вынік, станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Гэтак, у гістарычнай навуцы ўтварыўся парадаксальны сімбіёз савецкай інтэрпрытацыі гісторыі Беларусі і рускага шавіністычнага падыходу да гістарычнага мінулага краіны – умоўна назавем яго "заходнеруска-савецкая" плынь ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

Такім чынам, на пачатку 90-х гг. ХХ ст. распачалася распрацоўка нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, адно з цэнтральных месцаў у якой занялі пытанні расійскай урадавай палітыкі на Беларусі ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст.: быў адноўлены тэзіс аб каланіяльных становішчы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, адзначаўся адмоўны ўплыў русіфікацыйнай палітыкі царызму на развіццё беларускай мовы і кулітыры, станаўленне беларускай нацыянальнай самасвядомасці. У другой палове 90-х гг. ХХ ст. вызначыўся сурьёзны раскол у поглядах і падыходах беларускіх гісторыкаў да асвятлення стрыжневых пытанняў гісторыі краіны. У супрацьвагу нацыянальнай плыні ў беларускай гістарыяграфіі актывізавалася "заходнеруска-савецкая" плынь, у інтэрпрытацыі якой расійскі ўрад з'яўляўся выратавальнікам беларускага народа ад нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту палякаў, а палітыка "русіфікацыі" была скіравана на адраджэнне беларускай мовы, культуры і беларускай нацыянальнай самасвядомасці.

### *Літаратура і крыніцы*


1. Біч М. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. - № 1. – С. 15–24.
2. Нарысы гісторыі Беларусі. У2-х ч. / Рэд. М.П. Касцюк [і інш.] – Мінск, 1994. - Ч. 1.
3. Токць С. "Мураўёўшчына" і "мураўёўцы" // Літаратура і мастацтва. –1991. - 12 ліпеня. – С. 14-15; Токть С. , Карев Д. Граф М.Н. Муравьев – гвоздник политики и идеологии царизма в Белоруссии в 30-е – 60-е г.г. XIX века // Наш радавод. – Гродно, 1991. – Книга 3. - Часть 3. - С. 586-591; Гулак Н. "Слуга цару..."// Спадчына. – 1995. - № 1. – С. 70-79.
4. Сяльвестрава-Куль С. Між Польшчай і Расіяй. Моўная сітуацыя на Беларусі ў к. XVIII – XIX ст. // Голас Радзімы. - 1995 г. - 24 жніўня. – С. 4, 6.
5. Григорьева В.В. Из истории располячевания костёла в белорусских губерниях (взгляд на проблему через деятельность каноника Сенчиковского) // Наш радавод. – Гродно, 1992. - Кніга 4. – Ч. 3. – С. 672-680; Церашковіч П.У. Этна-канфесійная палітыка расейскай адміністрацыі і фарміраванне беларускай свядомасці ў друг. пал. XIX – пач. XX ст. // Наш радавод. – Гродно, 1992. – Кніга 4. - Частка 3. - С. 655-658.
6. Пічукоў В.П. Нацыянальнае пытанне ў праграме Віленскага генерал-губернатара П. Святаполк-Мірскага (1902 – 1904 гг.) // Нацыянальныя меншасці Беларусі. – Мінск, 1996. - Кніга 2. – С. 40-42.
7. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапаможнік: у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля – Мінск, 2000. - Ч. 1.
8. Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795-2002 гг.) – Мінск, 2003.
9. Трещенок Я.И. История Беларуси: Учебное пособие для студентов высших учебных заведений: В 2 частях. – 2-е издание. – Могилёв, 2004. - Часть 1.
10. История Белорусской ССР: в двух томах / Под ред. В. Н. Перцева [и др.]. - Минск, 1954. - Т.1; История Белорусской ССР: в двух томах / Ред. кол. Л.С. Абецедарский [и др.]. - Минск,1961. - Том 1.
11. Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России: в двух томах. – Вильна, 1867. – Т. 1; Миловидов А.И. Участие молодёжи Северо-Западного края в мятеже 1863 г. И вызванная им реформа учебных заведений. – Вильна, 1904.; Брянцев П.Д. Польский мятеж 1863 г. – Вильна, 1892.
12. Токць С.М. Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30 - 60-х гг. ХІХ ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус): аўтарэферат дысертацыі ... кандыдата гістарычных навук: 07.00.02; ІГ АНБ. – Мінск., 1997.
13. Роцька Н.А. Змены ў становішчы чыноўніцтва Беларусі (60 – 90-я гг. ХІХ ст.) // Веснік БДУ. Серыя 3. – 2000. - № 2. – С. 7-11.
14. Кіштымаў А. Аб характары становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. (Навукова-метадычныя рэкамендацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі) // Настаўніцкая газета. – 1996. - 10 лютага. – С. 3.
15. Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў к. XIX – пач. XX ст. – Мн.: НІА, 1998.
16. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В.В.Грыгор'ева [і інш.].; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск, 1998.
17. Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863-1914 гг. – Мінск, 2002.
18. Смалянчук А.Ф. Паміж краевасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864-1917 г. – Гродна, 2001.
19. Жытко А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861 -1914 гг. – Мінск, 2003.

20. Шыбека З. Гарады Беларусі (60-я гг. XIX ст. – пач. XX ст.) – Мінск, 1997.; Жихарев С.Б. Политика российского правительства в сфере железнодорожного транспорта и её реализация на территории Беларуси во втор. пол. XIX - нач. XX в.: автореферат диссертации ... кандидата исторических наук: 07.00.03; БГУ. – Минск, 2003; Карніевіч В.А. Развіццё гандлю ў Беларусі (1861-1900 гг.): аўтарэферат дысертацыі ... кандыдата гістарычных навук: 07.00.02; БДПУ ім. М. Танка. – Мінск, 2003.
21. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – Т. 4.
22. Бендин А.Ю. Граф М.Н. Муравьёв Виленский и национальное пробуждение белорусского народа в 60-е гг. XIX в. // Исторический поиск Беларуси: Альманах / Сост. А.Ю. Бендин. – Минск, 2006. – С. 53-77.
23. Бендин А.Ю. Проблемы этнической идентификации белорусов 60-х гг. XIX – начала XX в. в современной историографии // Исторический поиск Беларуси: Альманах / Сост. А.Ю. Бендин. – Минск, 2006. – С. 8-35.
24. Гигин В. Оклеветанный, но не забытый // Нёман. – 2005. - № 6. – С. 127-139.
25. Петриков, П.Т. Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е начало 2000-х годов). – Минск: Белорусская наука, 2007. – 292 с.

***Alexander Grakhotsky***

## MODERN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY OF THE RUSSIAN STATE POLICY IN BELORUS IN THE SECOND HALF OF XIXTH – IN THE BEGINNING OF XXTH CENTURY

*In the article the state of the modern Belarusian historiography of the Russian state policy in Belarus in the middle of XIX – in the beginning of XX cent., trends are defined in the historiography of a problem, the basis directions.*

*Key words: the modern Belarusian historiography, the Russian state policy, historiography, the Russian empire.*

Надійшла до редакції 9.03.2008 р.

УДК94(367)001.891

***Марина Кеда***

# СТАНОВЛЕННЯ ІСТОРІОГРАФІЇ ФРАНЦУЗЬКОЇ РЕВОЛЮЦІЇ В УКРАЇНСЬКИХ УНІВЕРСИТЕТАХ XIX ст.: МИХАЙЛО ПЕТРОВ

*У статті аналізуються погляди харківського професора XIX ст. Михайла Петрова на історіографію Французької революції. Особлива увага приділяється значенню його доробку в становленні цієї галузі історіографії в Україні.*

*Ключові слова: Михайло Петров, історіографія, Французька революція.*

Вивченням Великої Французької революції XVIII ст. вже більше двох століть опікується окрема галузь історіографії. На теренах України перші впевнені кроки в цьому напрямку було зроблено ще університетською професурою в другій половині XIX ст. На жаль, імена деяких дореволюційних істориків, що працювали в цьому напрямку, в радянські часи були штучно піддані забуттю. До їх числа належить і харківський історик другої половини XIX ст. Михайло Назарович Петров (1826 – 1887), відомий своїм чотиритомним курсом «Лекцій з всесвітньої історії» [12] та низкою нарисів «Із всесвітньої історії» [11].

Спадщина цього вченого через його монархічно-ліберальні погляди довгий час не заслуговувала на належну увагу дослідників. Лише окремі спеціалісти з історіографії наважувались обережно посилатись на його праці, підкреслюючи при цьому «консервативність» та «монархічні переконання» цього історика.

Водночас саме він першим в Російській імперії здійснив спеціальне комплексне дослідження здобутків новітньої європейської історіографії. Під терміном «новітня» він розумів історіографію кінця

 *© Кеда М.К., 2008*